Паляўнічыя на мёд.

БОРТНЫЯ ХРОНІКІ

Мы пачынаем новую рубрыку, у якой будзем распавядаць пра старадаўнюю традыцыю борцевага пчалярства. Сёння яна амаль забытая, аднак у Беларусі ёсць людзі, зацікаўленыя ў адраджэнні гэтага занятку — з іх ліку аўтар “Роднай прыроды” Іван Осіпаў. У кожным нумары вас чакаюць цікавыя факты з гісторыі развіцця борцевага пчалярства.

Як з’явіўся бортнік на беларускай зямлі? Каб адказаць на гэтае пытанне, нам разам з вамі трэба перанесціся далёка ў мінулае, ажно на 50 мільенаў гадоў таму, калі выраслі на планеце прыгожыя і салодкія кветкі. Усе яны патрабавалі апылення, а пчала была адным з першых насякомых, хто пачаў гэтую вялікую працу. Падчас апылення яна збірала і іншыя рэчывы, неабходныя ей для існавання, — нектар і пылок.

У Індыі вучоныя адшукалі “першую” пароду пчалы, ад якой і пайшлі ўсе астатнія. Адтуль яна пачала рассяляцца па іншых землях і дабралася да беларускіх абшараў. За доўгі час вандроўкі характар пчолкі змяніўся і стаў больш суровы “паўночны”. Пасялілася пчала ў лясах і пачала працаваць. Праз колькі гадоў з’явіліся ў тых лясах людзі, продкі нашы. Мужчыны хадзілі на паляванне, жанчыны займаліся збіральніцтвам. Аднойчы ў спякотнае надвор’е нехта заўважыў, што па дрэве бяжыць салодкі сок, а збіраюць яго маленькія істоты. Ён вырашыў сабраць мёд голымі рукамі, за што пчолы яго накаралі — моцна пакусалі. “Паляўнічы” прынёс здабычу і расказаў усім пра цуд: з дрэва бяжыць сок, а пчолкі яго абараняюць.

Пачалі людзі даглядаць такія дрэвы ды забіраць у пчол мёд. Гэты занятак больш нагадваў паляванне без зброі (а калі б і была тая зброя, то не дапамагла б яна супраць маленькай, але ваяўнічай лясной істоты). Здабычай мёду займаліся толькі спрытныя і моцныя мужчыны, яны мусілі вельмі хутка бегаць, спрытна ўзлазіць на дрэва. Так і нарадзіўся ў нашых лясах (а ў іншых народаў, у скалах і пячорах) новы занятак — бортніцтва. Што ж гэта такое? Адгалінаванне збіральніцтва, старадаўні лясны промысел, які звязаны з доглядам дзікіх пчол у натуральных умовах іх існавання. Па тэрыторыі сучаснай Беларусі гэтым рамяством займаюцца ў лясах і на балотах.

Само слова “бортніцтва” паходзіць ад праславянскага “бор”, што азначае “сасновы лес” альбо “дзірка”, “дупло”. “Борціць” — значыць выдзёўбваць дупло ў дрэве, дзе змогуць жыць дзікія пчолы-бароўкі. Мядоныя паляўнічыя завуцца бортнікамі ці вотчычамі. Першае ўзгадванне бортніка зафіксавана не ў кніжках, а было намалявана ў павучынай пячоры Куэвас-дэ-ла-Аранья, што ў Іспаніі. Разам са сцэнамі палявання на дзікіх жывёл, старажытны мастак паказаў бортніка, які збірае мёд дзікіх пчол. Так бортнік і паляўнічы апынуліся разам, бо адна справа ўпаляваць жывёліну, іншая — знайсці да яе падыход. Пазней частка людзей пачала вучыцца “паляванню” толькі на мёд, паступова ператвараючыся ў бортнікаў — тых, што з года ў год клапоцяцца пра жывую істоту, якую яны не прыручылі, а з якой жывуць побач.

Бортніцтва развівалася пастунова і выпрацоўвала адмысловыя тэхнікі, традыцыі і абрады, прылады. Пасля гэты промысел стаў асобным відам, а бортнікі зрабіліся адасобленай групай грамадства — яны лічыліся знахарамі, варажбітамі, да іх прыходзілі раіцца па розных жыццёвых пытаннях. Лічылася, што толькі добрыя людзі могуць быць бортнікамі, акрамя таго, толькі яны могуць, як вавёрка, узлезці на вялікае дрэва без галін.

Зараз ужо цяжка сказаць, што адчуваў чалавек у старажытнасці, калі здабываў цудоўны мядовы скарб. Але калі вы

паспрабуеце мёд сёння, то адчуецс салодкі смак мінулых стагоддзяў і мінулага лета.

Іван ОСІПАЎ

Источник: Родная прырода. — 2015. — №7. — С.51.

Наскальны малюнак з Павучынай пячоры ў Іспаніі (Куэвас-дэ-ла-Аранья паблізу Бікорпа ў Валенсіі (9000 гадоў да н.э.).

Сярэднявечны манускрыпт, захоўваецца ў Ватыкане.

Малюнак у грабніцы Пабаса ў Фівах (каля 300 гадоў да н.э.).